# АКАДЭМІК ВАСГНІЛ М. М. СЕВЯРНЁЎ
## (Да 70-годдзя з дня нараджэння)



Імклівае развіццё навукі і тэхнікі ў XX ст., бурны ход палітычных і сацыяльных працэсаў у нашай краіне дазволілі вылучыцца на перадавыя пазіцыі здольным, таленавітым людзям з простага народа, якія прыйшлі ва універсітэты і інстытуты, імкнучыся авалодаць ведамі і дасягнуць вышынь навукі. Менавіта да гэтага пакалення людзей належыць доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік ВАСГНІЛ Міхаіл Максімавіч Севярнёў.

М. М. Севярнёў нарадзіўся 21 лістапада 1921 г. у невялікай вёсцы Север ляснога Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і селяніна, у якога, акрамя яго, было яшчэ трое дзяцей. З дзяцінства ён прымаў удзел ва ўсіх сельскагаспадарчых работах, і гэта веданне сельскага жыцця знутры стварыла цвёрдую базу для ўсёй яго наступнай навуковай дзейнасці.

У цяжкім для краіны 1941 г. М. М. Севярнёў закончыў сярэднюю школу, але пачалася вайна і на зямлю Беларусі прыйшлі захопнікі. Сялянскі хлопчык не застаўся ў баку ад бурлівага жыцця. З першых дзён вайны ён становіцца яе актыўным удзельнікам: працуе ў падпольнай камсамольскай арганізацыі, а затым пераходзіць у партызанскі атрад. Шмат цяжкіх выпрабаванняў выпала на яго долю за тры гады: удзел у «рэйкавай вайне», разведвальныя рэйды, прарыў блакады ў сцюдзёную зіму 1943 г.

Пасля вызвалення рэспублікі ў жніўні 1944 г. былы партызан М. М. Севярнёў стаў сяржантам Савецкай Арміі і са сваім мінамётным разлікам дайшоў да Кёнігсберга. За ўдзел у баявых дзеяннях у перыяд Вялікай Айчыннай вайны М. М. Севярнёў узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

У 1946 г. М. М. Севярнёў паступіў на аўтатрактарны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. У 1950 г. ён апублікаваў першую навуковую працу «Удасканальванне сістэмы змазкі рухавіка ЯМЗ-207».

Пасля заканчэння ў 1951 г. інстытута М. М. Севярнёў працаваў асістэнтам і адначасова праходзіў аспіранцкую падрыхтоўку ў Акадэміі навук БССР. У 1954 г. ён абараніў кандыдацкую дысертацыю, прысвечаную пытанням механізацыі меліярацыйных работ, што было вельмі актуальна для рэспублікі, якая пачынала бяспрыкладную праграму работ па акультурванні сельскагаспадарчых угоддзяў.

У 1954 г. М. М. Севярнёў прыходзіць на працу ў Цэнтральны навукова-даследчы інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспа-

даркі (ЦНДІМЭСГ) Нечарназёмнай зоны СССР, дзе ў хуткім часе становіцца загадчыкам лабараторыі. У гэты час у сувязі з рэзкім ростам паставак на вёску машын і абсталявання перад інжынернай навукай рэспублікі паўстаюць задачы па забеспячэнні высокаэфектыўнай эксплуатацыі машынна-трактарнага парка. М. М. Севярнёў пачынае распрацоўку новага напрамку. Пад яго кіраўніцтвам і пры яго непасрэдным удзеле выконваецца цыкл работ па абгрунтаванні рамонтна-абслугоўваючай базы для сельскагаспадарчай тэхнікі, распрацоўваюцца тыпавыя тэхналогіі рамонту, адпрацоўваюцца метады аднаўлення зношаных дэталяў сельгасмашын. У выніку абагульнення матэрыялаў даследаванняў ім была падрыхтавана і ў 1966 г. абаронена доктарская дысертацыя, у якой выкладзены навуковыя асновы працаздольнасці і даўгавечнасці сельскагаспадарчай тэхнікі.

У 1965 г. М. М. Севярнёў, прызначаны дырэктарам ЦНДІМЭСГ, накіроўвае ўсю сваю энергію на арганізацыю навуковай працы ў інстытуце, развіццё яго базы і павышэнне ўзроўню распрацовак. Надаючы вялікую ўвагу вызначэнню перспектыўных шляхоў развіцця навуковага пошуку ва ўсіх галінах сельскагаспадарчай вытворчасці, ён працягвае фарміраваць школу спецыялістаў па праблемах надзейнасці і даўгавечнасці машын, якія працуюць у экстрэмальных сельскагаспадарчых умовах. За паспяховую дзейнасць па падрыхтоўцы навуковых кадраў у 1969 г. яму прысвоена навуковае званне прафесара.

Даследаванні інстытута пад кіраўніцтвам М. М. Севярнёва істотна ўплываюць на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі. Прызнаннем навуковага ўкладу ў гэты працэс дырэктара з'яўляецца абранне яго ў 1972 г. членам-карэспандэнтам ВАСГНІЛ.

З 1972 па 1976 г. М. М. Севярнёў працуе намеснікам Старшыні Савета Міністраў БССР. У 1976 г. вяртаецца ў ЦНДІМЭСГ у якасці дырэктара, выконваючы адначасова абавязкі акадэміка-сакратара Заходняга аддзялення ВАСГНІЛ з 1976 па 1980 г. У гэты перыяд у інстытуце ствараецца сельскагаспадарчая тэхніка, найлепш прыстасаваная да асаблівасцяў прыродна-кліматычных умоў рэспублікі. Распрацоўваюцца новыя ўборачныя машыны — жняяркі ЖСК-4А і ЖСК-4Б, машыны для нарыхтоўкі і прыгатавання кармоў — КОРК-15, ЛОС-3, ІСК-3, ГВШ-3, машыны для правядзення меліярацыйных і культуртэхнічных работ. У 1978 г. М. М. Севярнёву прысуджаецца Дзяржаўная прэмія Беларускай ССР у галіне навукі і тэхнікі, ён абіраецца сапраўдным членам-акадэмікам ВАСГНІЛ.

Уласцівае акадэміку М. М. Севярнёву пачуццё новага, арганізатарскі вопыт, вялікая эрудыцыя дазваляюць яму плённа працаваць па выхаванні навуковых кадраў. Ён з'яўляецца актыўным членам спецыялізаваных саветаў і пастаянна апаніруе на абаронах кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. У ліку яго вучняў 40 дактароў і кандыдатаў навук.

Абмежаванасць запасаў арганічнага выкапнёвага паліва, якое з'яўляецца традыцыйнай крыніцай энергіі для сельскагаспадарчай вытворчасці, у значнай ступені запавольвае тэхнічны прагрэс. Рост народанасельніцтва і задавальненне яго ўзрастаючых матэрыяльных патрэбнасцей без дадатковых затрат выкапнёвых энерганосьбітаў патрабуюць прынцыпова новага падыходу да распрацоўкі прагрэсіўных энергазберагальных тэхналогій у сельскай гаспадарцы, селекцыі перспектыўных сартоў раслін і парод жывёлы, абгрунтавання сістэм машын і мерапрыемстваў па выкарыстанні сродкаў аўтаматызацыі, робататэхнікі, хімізацыі.

Пакінуўшы ў 1983 г. пост дырэктара ЦНДІМЭСГ Нечарназёмнай зоны СССР, акадэмік М. М. Севярнёў узначальвае лабараторыю выкарыстання паліўна-энергетычных рэсурсаў у сельскай гаспадарцы, у якой праводзіць навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія работы як па абгрунтаванні павышэння эфектыўнасці выкарыстання традыцыйных відаў энерганосьбітаў у сельскай гаспадарцы на аснове нарміравання іх

прымянення не на ўмоўныя, а на фактычныя паказчыкі, так і па стварэнні тэхнічных сродкаў для выкарыстання ў сельскай гаспадарцы нетрадыцыйных крыніц энергіі. Пад яго кіраўніцтвам у апошнія гады створаны і даведзены да стадыі доследна-прамысловага ўкаранення геліяўстаноўкі для падагравання вады і паветра на тэхналагічныя і бытавыя патрэбы ў сельскай гаспадарцы, якія адпавядаюць сусветнаму ўзроўню развіцця навукі і тэхнікі. Прайшлі дзяржаўныя прыёмачныя выпрабаванні і рэкамендаваны да вытворчасці такія віды тэхнікі, як геліяпадагравальнік паветра для сушкі сельскагаспадарчай прадукцыі ГПВ-240, установка для падагравання вады для малочна-таварнай фермы на 200 галоў ГВП-20, бытавыя геліяводападагравальнікі «Гелекс-150» і «Гелекс-75». Распрацоўваюцца камбінаваныя сістэмы энергазабеспячэння сельскагаспадарчых аб'ектаў з выкарыстаннем аднаўленчых крыніц энергіі.

Акадэмік ВАСГНІЛ М. М. Севярнёў з'яўляецца членам прэзідыума Беларускага аддзялення ВАСГНІЛ, намеснікам старшыні Праблемнага навуковага савета пры Мінсельгасхарчы Беларусі і Акадэміі навук Беларусі, старшынёй экспертнай камісіі ДКНТ СССР па ацэнцы эфектыўнасці навукова-тэхнічных праграм. Пры гэтым вялікую ўвагу ён надае навукова-метадалагічнай рабоце па распрацоўцы прынцыпова новых падыходаў да ацэнкі эфектыўнасці інвестыцый у аграпрамысловую навуку на падставе выкарыстання абагульненых энергетычных паказчыкаў.

Акадэмікам ВАСГНІЛ М. М. Севярнёвым асабіста і ў сааўтарстве напісана больш за 200 навуковых прац; пад яго рэдакцыяй выйшла больш чым 50 зборнікаў прац, манаграфій і тэматычных зборнікаў. Высокі ўзровень тэхнічных рашэнняў, заснаваных на выніках даследаванняў, пацвярджаецца больш чым 30 аўтарскімі пасведчаннямі на вынаходніцтвы.

Разам з тым, нягледзячы на пастаянную занятасць навуковай і грамадскай працай, прафесар М. М. Севярнёў працягвае плённую педагагічную дзейнасць. Ён не толькі кіруе падрыхтоўкай аспірантаў, але і праводзіць заняткі са студэнтамі Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі на кафедры «Асновы даследаванняў і новых тэхналогій у сельскагаспадарчай вытворчасці», якая функцыяніруе на базе ЦНДІМЭСГ.

Акадэміка М. М. Севярнёва можна па праву аднесці да вядомых дзяржаўных дзеячаў Беларусі. Ён з'яўляўся членам урада рэспублікі, у 1971 і 1975 гг. абіраўся ў склад Вярхоўнага Савета Беларусі, дзе кіраваў работай пастаяннай дэпутацкай камісіі па сельскай гаспадарцы.

Акрамя баявых узнагарод, атрыманых у гады вайны, Міхаіл Максімавіч Севярнёў за высокія дасягненні калектыва інстытута і асабісты творчы ўклад у развіццё сельскагаспадарчай інжынернай навукі ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі, а таксама Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Усё жыццё акадэмік ВАСГНІЛ, доктар тэхнічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Міхаіл Максімавіч Севярнёў аддаў развіццю інжынернай сельскагаспадарчай навукі. Сёння яго імя, яго працы, яго школа шырока вядомы па ўсёй краіне і за яе межамі. Свой 70-гадовы юбілей ён сустракае ў поўным росквіце творчых сіл і магчымасцей, займаючы дастойнае месца сярод буйных дзеячаў сельскагаспадарчай навукі.

*П. І. АЛЬСМІК, І. С. НАГОРСКІ, С. Г. СКАРАПАНАЎ,*
*В. С. АНТАНЮК, В. Ф. КАРЛОЎСКІ, У. П. САМСОНАЎ*